Казакова, Т.П. Грамадска-палітычныя падзеі першай паловы ХУ ст. у творчасці Грыгорыя Цамблака / Т. П. Казакова // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 123–125

***Т. П. КАЗАКОВА***

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАДЗЕІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XV ст. У ТВОРЧАСЦІ ГРЫГОРЫЯ ЦАМБЛАКА

Царкоўная і літаратурная дзейнасць Грыгорыя Цамблака ў Вялікім княстве Літоўскім адбывалася ў перыяд найбольшай магутнасці Беларуска-Літоўскай дзяржавы, калі «развязанне грамадскіх калізій патрабавала не толькі адмаўлення ад асабістага дзеля агульнай справы, але і надзвычай плённага развіцця чалавечых здольнасцяў»[1]. Моцная дзяржава Еўропы мела патрэбу ў ідэалагічным абгрунтаванні сваёй аб’яднаўчай палітыкі, у літаратуры фарміруецца вобраз дзейснага чалавека, справы, якія здзяйсняе асоба, разглядаюцца ў гістарычным аспекце.

Менавіта ў гэты час ствараюцца першыя беларуска-літоўскія летапісы, «Пахвала Вітаўту» і выдатныя творы Грыгорыя Цамблака. А. В. Ліпатаў слушна заўважыў, што ва ўмовах сярэднявечча таленавітыя творы ўзнікалі ў той час, «калі аўтары іх цалкам падпарадкоўвалі сябе ідэі агульнанароднага значэння»[2].

Паводле ідэйнай скіраванасці і праблематыкі творчасць Грыгорыя Цамблака адпавядала працэсам этнічнай кансалідацыі і палітычнай цэнтралізацыі, якія адбываліся ў гэты час у Вялікім княстве Літоўскім. У 1415 г. на саборы епіскапаў у Навагрудку ён быў абраны мітрапалітам «Кіева і ўсёй Літоўскай дзяржавы». Светапогляд мітрапаліта сфарміраваўся пад уплывам ісіхазму. Згодна з вучэннем ісіхастаў, чалавек спасцігае энергію Бога шляхам псіхафізічнага «самазаглыблення» і «сузірання», што і пабуджае яго да ўнутранай духоўнай актыўнасці і засяроджанасці ў малітве. Вынікам містычнага дзеяння чалавека і Бога з’яўляецца літаратурная творчасць, таму для пісьменнікаў-ісіхастаў **слова** было свяшчэнным, яны імкнуліся здабываць са слова як мага «больш знешніх эфектаў»[3]. Слову адводзілася роля пасрэдніка паміж боскім і зямным, яно выступала «знакам» нябеснага свету, мела магічную сілу.

На нашых землях Грыгорый Цамблак адчуў сябе паўнамоцным прадстаўніком народа, напісаў пятнаццаць твораў розных жанраў (энкоміі, жыціі, духоўны верш, пропаведзі і інш.).

Агіяграфічныя творы і прамовы Грыгорыя Цамблака працінае пачуццё смутку і болю за лёс славянскіх народаў, якія знаходзіліся пад уладай туркаў і татара-манголаў. У яркай прамове на Канстанцкім саборы дамінуе ідэя славянскага адзінства: «Христос съедини нас крещением и ко волным страсти



грядый!» [4] Пісьменнік, таленавіта аздабляючы свае творы элементамі драматычнага эфекту, шырока выкарыстоўваючы метафарычную, сінанімічную і цытатную ампліфікацыю, біблейскую сімволіку, абвінавачвае шматлікіх «мучителей», «варвараў» і «усекателей» хрысціян («Слова пахвальнае Яўфімію»).

Гістарычнасць быцця і праблема зямнога прызначэння чалавека асэнсоўваецца ў «Слове пахвальным Дзімітрыю», «Надмагільным слове Кіпрыяну» і «Слове пахвальным Яўфімію».

На фоне падзей біблейскай гісторыі паказана дзейнасць патрыёта Балгарыі, настаўніка Грыгорыя Цамблака, «пастыря Христова стада» Яўфімія, які быў не толькі асветнікам

народа, ажыццявіў рэформу пісьменнасці ў Балгарыі, заклікаў да адраджэння моўных прынцыпаў Кірылы і Мяфодзія, але і змагаром. Твор прасякнуты ідэяй славянскай еднасці, гнеўным асуджэннем турэцкай агрэсіі і тугой па спакутаванай Радзіме.

Удзел мітрапаліта Вялікага княства Літоўскага ў працы XVI Усяленскага сабору каталіцкай царквы ў Канстанцы на працягу некалькіх стагоддзяў выклікаў розныя меркаванні даследчыкаў. Я. Галубінскі не сумняваўся ў яго «цвёрдай адданасці праваслаўю», але лічыў, што ёсць падстава назваць яго «кар’ерыстам і авантурыстам»[5].

Па загаду Вітаўта і Ягайлы Цамблак быў адпраўлены на чале вялікай дэлегацыі на Канстанцкі сабор, дзе сярод шматлікіх праблем абмяркоўваліся і пытанні аб турэцкім нашэсці на паўднёваславянскія краіны і ўзаемаадносіны з Тэўтонскім ордэнам.

У Канстанцы Цамблак праводзіў з праваслаўнымі ўдзельнікамі сабору літургіі, у якіх прымалі ўдзел прадстаўнікі роду князёў Астрожскіх, святары з Віцебска, Наваградка, Полацка і Смаленска, выступіў з дзвюма прамовамі. На думку мітрапаліта Вялікага княства Літоўскага, толькі ў свабоднай дыскусіі можна вырашыць усе пытанні, якія ўзнікалі паміж каталікамі і праваслаўнымі, але папа Марцін V не ўключыў у парадак дня гэтую прапанову Цамблака і не стаў склікаць спецыяльны сабор.

У «Слове пахвальным Дзімітрыю» прапаведнік, закранаючы праблему ўзаемаадносін царкоўнай і свецкай улады, мадэліруе ў абстрактна-алегарычнай форме грамадскую рэчаіснасць Вялікага княства Літоўскага, абвінавачвае тых уладароў, якія жорсткія да сваіх падначаленых і непаслядоўныя ў веры, ухваляе подзвіг Дзімітрыя Салунскага, які ахвяраваў жыццём у імя хрысціянскіх ідэалаў. Грыгорый Цамблак, выкарыстоўваючы прынцып «двайнога адлюстравання» і прыёмы «извития» слоў, сцвярджае, што насілле — праява бездухоўнасці і антычалавечнасці. Спалучаючы прыёмы



абстрагавання і псіхалагічнай пранікнёнасці, пісьменнік паказвае «ўнутраны свет» сваіх герояў, іх хрысціянскія дабрачыннасці і значнасць рэлігійна-асветніцкай дзейнасці.

Такім чынам, у сваіх творах Грыгорый Цамблак значныя грамадска-палітычныя падзеі пачатку XV ст. разглядае пад знакам вечнасці, чуйна рэагуе на праблемы часу і праз складаную сістэму «пляцення славес» акрэслівае грамадзянскую пазіцыю. Таленавіта развіваючы грэка-славянскую традыцыю ўрачыстага красамоўства, мітрапаліт Вялікага княства Літоўскага набліжаў абстрактныя ідэі боскіх кніг да пытанняў грамадскага быцця.

---

[1] *Гаранін С. Л.* Шляхамі даўніх вандраванняў. Мн., 1999. С. 124.

[2] *Липатов А. В.* Проблемы общей истории славянских литератур от средневековья до середины XIX в. // Славянские литературы в процессе становления и развития. От древности до середины XIX в. М., 1987. С. 32.

[3] *Лихачёв Д. С.* Культура Руси времени Андрея Рублева и Епифания Премудрого (конец XIV — начало XV в.). М.; Л., 1962. С. 60.

[4] *Никольский Н. К.* Материалы для истории древнерусской духовной письменности // Сб. отд. русского языка и словесности. Т. 82. № 1—8. СПб., 1907. С. 151.

[5] *Голубинский Е. Е.* История русской церкви. Т. 2. М., 1990. С. 386.